12. *Гісторыя* Беларускай ССР. Т.1. Першабытнаабшчынны лад на тэрыторыі Беларусі. Эпоха феадалізму. – Мн.: Навука і тэхніка, 1972. – С.512.

13. *Ученый* комитет МНП. – ЦГИА. Ф.734, ед. хр.1516, 1817—1831, 1856—1917 гг.

14. *Объяснительная* записка к воскресным и праздничным чтениям в народных училищах Виленской губ. – [Вильно: тип. А.Зака, 1883]. – 23 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Л.У.Ляховіч,**
*ст. выкладчык*

# АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ КІРЫЛЫ І МЯФОДЗІЯ Ў КАНТЭКСЦЕ МЕНТАЛІТЭТУ І КАНФЕСІЙНЫХ АДНОСІН СЯРЭДНЯВЕЧЧА

Дзейнасць братоў Кірылы і Мяфодзія, асветнікаў і прапаведнікаў хрысціянства, стваральнікаў славянскай азбукі кірыліцы, шырока вядомая ўсяму свету.

Браты нарадзіліся ў г. Салуні (цяпер Салонікі ў Грэцыі), большасць даследчыкаў лічаць іх балгарамі. Кірыла (827—869), да прыняцця манаства Канстанцін, атрымаў адукацыю пры візантыйскім імператарскім двары, стаў святаром, працаваў бібліятэкарам патрыярха Фоція. Пазней быў прызначаны настаўнікам філасофіі, за што быў празваны Філосафам. У пачатку 860-х гг. з дыпламатычна-рэлігійнай місіяй наведаў хазар у грэчаскай калоніі Херсанес у Крыме. Мяфодзій (815—885) быў на ваеннай службе і 10 гадоў кіраваў адной з падуладных Візантыі славяна-балгарскіх абласцей, потым стаў ігуменам манастыра Паліхрон на беразе Мармуровага мора.

У 863 г. Кірыла і Мяфодзій былі запрошаны ў Маравію для пропаведзі хрысціянства на славянскай мове. Яны прыбылі сюды са створанай імі славянскай азбукай на аснове

грэчаскага напісання літар і ўласнымі перакладамі рэлігійных кніг на славянскую мову, вялі па-славянску царкоўную службу. Гэта было тым больш важна, што ў IX ст. Біблія магла быць толькі ў трох моўных варыянтах (лацінскім, грэчаскім і яўрэйскім). Але, сутыкнуўшыся з нямецкімі місіянерамі, якія прапаведвалі на лацінскай мове, браты былі вымушаны пакінуць Маравію. У 867 г. па запрашэнні папы Мікалая I яны прыбылі ў Рым, дзе адстойвалі славянскую мову ў літургіі. Пасля смерці ў Рыме Кірылы Мяфодзій быў пасвечаны ў сан епіскапа, працягваў асветніцкую і прапаведніцкую дзейнасць у Візантыі і Маравіі. Браты фактычна сталі стваральнікамі літаратурнай мовы, зразумелай тады ўсім славянскім народам і стаўшай сімвалам культурнага адзінства славян. На тэрыторыі Беларусі пра дзейнасць Кірылы і Мяфодзія ведалі ў XI ст. праз твор Чарнарызца Храбра "О письменах" і інш. Асветнікі кананізаваныя праваслаўнай царквой як роўнаапостальныя Кірыла і Мяфодзій. Але толькі такое разуменне іх дзейнасці, замкнёнае на праваслаўным і славянскім свеце, з'яўляецца вузкім і аднабаковым.

Паводле рэалій IX ст., калі шляхі ўсходняга і заходняга хрысціянства ўжо разыходзіліся, але без праяў адкрытай варожасці і з рэгуляваннем спрэчных пытанняў, у дзейнасці братоў-асветнікаў змешваліся інтарэсы як Рыма, так і Канстанцінопаля.

Спачатку браты жылі ў сталіцы Візантыі і былі цывільнымі кніжнікамі. У 862 г. князь Расціслаў, правіцель Вялікай Маравіі, прыбыў да візантыйскага імператара Міхаіла і папрасіў для насельніцтва сваёй краіны, якое прытрымлівалася хрысціянскага закону, настаўнікаў, якія б змаглі весці пропаведзі на славянскай мове. Больш трох гадоў Канстанцін і Мяфодзій працавалі ў Маравіі.

Вяртаючыся ў Канстанцінопаль, браты сустрэлі ў Венецыі папскага ганца, з якім прыбылі ў Рым. Менавіта ў Рыме папа Адрыян II даў братам сан святароў. Захаваўся



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ліст папы мараўскім князям Расціславу, Святаполку ў Кацэлу, дзе, у прыватнасці, адзначана: "Мы же, втройне испытав радость, положили послать сына нашего Мефодия, рукоположив его и с учениками в ваши земли, дабы учили они вас, как вы просили, переложив писание на ваш язык, и совершали бы полные обряды церковные и святую литургию..." Потым папа рымскі зрабіў Канстанціна епіскапам, а спецыяльна для Мяфодзія аднавіў Срэмскую мітраполію.

Каб зразумець, кім былі Кірыла і Мяфодзій для славян, патрэбна звярнуцца да менталітэту чалавека еўрапейскага сярэднявечча. Жыццё Кірылы і Мяфодзія прыпадае на перыяд так званых "цёмных вякоў" (V—X стст.). Гэты быў час найглыбейшага крызісу ў эканоміцы і гандлі. Рэгрэсіравалі вытворчасць, сельская гаспадарка, дзе была амаль страчана агракультура антычнасці. Еўропа пакутавала ад эпідэмій, голаду і хвароб; чума знішчала цэлыя тэрыторыі. З вялікімі цяжкасцямі была расчышчына пляцоўка для пабудовы хрысціянскай цывілізацыі. З'явіўся новы фактар — усёабдымная рэлігія, яна ахапіла як жыццё грамадства, так і асобнага чалавека.

Распад Рымскай імперыі, шматлікія войны, стварэнне і гібель першых варварскіх каралеўстваў, вымушаныя міграцыі, цяжкія ўмовы жыцця прыводзілі да нестабільнасці еўрапейскага хрысціянскага свету. Страціўшы надзею забраць "скарбы зямныя", хрысціяне пачалі сабіраць "скарбы нябесныя". Хрысціянская рэлігія была адзінай апорай, якая дапамагала чалавеку выжыць. Дух чалавека сярэднявечча, звернуты да Бога, быў больш моцны за яго цела, змучанага дрэнным харчаваннем, цяжкай працай і пастаяннымі хваробамі. Чым горш жылося чалавеку, тым часцей ён звяртаўся да Бога. Усе цяжкасці жыцця для хрысціяніна былі Божым выпрабаваннем дзеля падрыхтоўкі да "тысячагадовага царства Хрыста" і ўвашэсця ў "град нябесны". Багаслоўская навука, росквіт якой прыпадаў на



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Высокае сярэднявечча, пачыналася ў манастырах "цёмных вякоў". У гэтую нестабільную эпоху рэлігія не адмаўляла нікому ў суцяшэнні, і адкрытасць хрысціянства была яго моцным бокам у сэнсе далучэння вернікаў. Думкі аб Богу займалі сярэдневяковага чалавека значна больш, чым клопаты пра асабісты дабрабыт. Сярэднявечча — гэта эпоха Боскага пачатку ў культуры, як Адраджэнне — эпоха ўзнясення чалавека, а век Асветы — эпоха праслаўлення чалавечага розуму.

Сярэднявечча існавала пад знакам адзінай кнігі — Біблії. Антычныя веды і культура былі выціснутыя хрысціянствам, царква захоўвала манаполію на адукацыю, усе адукаваныя людзі выходзілі з манастыроў, уся пісьмовая культура "цёмных вякоў" была царкоўнай, заснаванай на Бібліі. Пры амаль поўнай непісьменнасці насельніцтва, калі галоўным аргументам царквы была пропаведзь, у хрысціянстве не засталося канкурэнтаў у духоўным плане. Біблія была не толькі Свяшчэнным Пісаннем, зборам правіл паводзін і запаведзяў. Гэта была адзіная даступная крыніца ведаў. Слова Божае было непахісным, менталітэт сярэднявечча будаваўся на біблейскай сімволіцы, ва ўсіх сферах жыцця біблейскія катэгорыі былі амаль адзіным спосабам пазнання і апісання свету. Дарэчы, гісторыя чалавецтва, адлюстраваная ў Старым Запавеце, змяшчала не толькі справы мінулага, але і ўказанні на сучаснасць і будучыню аж да Суднага дня.

Калі прыняць да ведама сказанае, дзейнасць Кірылы і Мяфодзія набывае новы аспект. Яшчэ да афіцыйнага прыняцця ўсім славянскім светам хрысціянства і канчатковага афармлення праваслаўнай плыні Кірыла і Мяфодзій неслі "слова Божае" славянам і далучалі іх да агульнаеўрапейскай культурнай прасторы, фарміруючы адпаведны светапогляд. У гэтым сэнсе асветнікі выступаюць як хрысціянскія місіянеры "грэчаскага" кірунку, а кірылічнае пісьмо стала адметнасцю славянскай цывілізацыі. У



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці Кірылы і Мяфодзія можна вылучыць і яшчэ адзін, геапалітычны аспект, звязаны з цеснымі адносінамі розных канфесій еўрапейскага сярэднявечча.

Сярэднявечча — гэта, бадай, адна з найбольш фанатычных і агрэсіўных эпох у гісторыі Еўропы. Пры гэтым існавалі "грэкі" і "лаціняне" (будучыя праваслаўныя і каталікі), побач з імі жылі прыхільнікі розных хрысціянскіх ерасей, а таксама мусульмане і іудзеі.

Пры такім раскладзе сіл па шэрагу прычын "лацінскі" (каталіцкі) свет быў вельмі агрэсіўна настроены. Шляхі двух плыняў хрысціянства — каталіцызму і праваслаўя — разышліся яшчэ да схізмы 1054 г. Так, грэчаская царква займала падпарадкаванае становішча ў адносінах да імператара. У заходнім жа свеце ў перыяд "цёмных вякоў" не было моцнага вярхоўнага правіцеля, і царква стала значным і незалежным суб'ектам палітыкі, займаючы ўсё больш трывалыя пазіцыі і з'яўляючыся буйнейшым пасля караля землеўладальнікам.

Пачынаючы з IXст. Заходняя Еўропа лічыла сябе адзіным носьбітам хрысціянскай веры. Пры гэтым "лаціняне" рабіліся ўсе больш ваяўнічымі, што ўвасобілася ў адкрытай варожасці, асабліва пасля схізмы 1054г. Жыхары каталіцкага свету лічылі ворагамі не толькі язычнікаў і мусульман, але і праваслаўных, пры гэтым нянавісць да праваслаўных (схізматыкаў) была мацнейшай за непрыязь да прыхільнікаў ісламу. Апафеозам гэтай непрыязі стаў захоп крыжакамі ў 1204 г. Канстанцінопаля і жудасны пагром, які яны ўчынілі. Візантыйскія храністы лічылі сарацынаў гуманнымі ў параўнанні з лаціанамі.

Акрамя крыжовых паходаў, хрысціяне (і праваслаўныя, і каталікі) займаліся місіянерствам. Але метады былі розныя — "грэкі" дзейнічалі больш дыпламатычна (прыклад — хрышчэнне кіеўскага князя Уладзіміра дзеля шлюбу з візантыйскай прынцэсай), а "лаціняне" — агнём і мячом (крыжовыя паходы, барацьба з мусульманамі, жорсткасць да еўрапейцаў-язычнікаў).



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У такіх умовах славянскі мір павінен быў выжыць і ўмацавацца, неабходна было захаваць і адстаяць сваю культурную этнічную адметнасць. У значнай ступені гэта было дасягнута дзякуючы кірылічнай моўнай традыцыі. У гэтым кантэксце велізарную ролю дзейнасці Кірылы і Мяфодзія нельга перабольшыць.

**О.В.Мазаник,**
*доцент*

## ПРОСВЕТИТЕЛЬСКИЕ ТЕНДЕНЦИИ В ДИРИЖЕРСКОМ ИСКУССТВЕ БЕЛАРУСИ НА СОВРЕМЕННОМ ЭТАПЕ

Просветительство – одна из основных функций оркестрового дирижерского исполнительского искусства. Выдающийся дирижер современности К.Кондрашин подчеркивал: “Мы должны осознать, что конечная цель художника-дирижера, исполнителя — просветительская, воспитательная, и только замыкаться в партитуре мы не имеем права” [1, с.189]. В дирижерском искусстве Беларуси, становление которого охватывает длительный период, на всех этапах его развития ярко прослеживаются тенденции художественно-эстетического воспитания, просветительства, популяризации как образцов мировой классики, так и национальной музыки.

Рассматривая деятельность областных оркестровых коллективов на современном этапе, слудует отметить, что повышение общего культурного уровня на периферии не только в области музыкального искусства приобретает все большую актуальность. Разнообразные формы концертно-просветительской деятельности оркестров позволяют привлечь широкий круг слушателей к вершине музыкального искусства – оркестровому исполнительству.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ